ўжывалася рыба, бо на марскіх астравах, якімі з'яўляюцца Салаўкі, рыба – самы даступны прадукт, а вось гародніну прыходзіцца вазіць з мацерыка. У многіх памесных праваслаўных цэрквах міранскі статут посту адрозніваецца ад манастырскага меншай строгасцю.

Вельмі важным патрабаваннем да поснай ежы з'яўляецца тое, каб яна была простай – не патрабавала шмат часу на прыгатаванне – і недарагой, каб вызваліць больш сродкаў на добрыя справы. Ян Златавусны ў сваіх настаўленнях жорстка высмейвае багатых хрысціянаў свайго часу, якія мелі для посту асобныя рондалі, у якіх мяса нават ніколі не варылася, але пры гэтым не забываліся цешыць сябе дарагімі фруктамі і іншымі прысмакамі, недаступнымі простым людзям. Ну, і самае важнае – гэта тое, што Вялікі пост важна прысвяціць сапраўднаму навяртанню да Бога.

Вялікі пост багаслужбова завяршаецца навячэр'ем Лазаравай суботы, якая адкрывае іншы перыяд: перыяд Пасхі Крыжа. У гэты час, нягледзячы на завяршэнне Святой Чатырохдзесятніцы, пост не прыпыняецца, а становіцца больш строгім, больш напружаным у духоўным сэнсе і працягваецца аж да светлага свята Пасхі – Уваскрасення Хрыстова.

---

**З блаславення настаяцеля Свята-Міхайлаўскага прыхода**
**протаіерэя Ігара Галакава**
***Укладальнік: Алесь Спіцын***
**Дата выпуску: 13 сакавіка 2016 г.**



МІХАЙЛАЎСКІ ЛІСТОК
САКАВІК, 2016
Свята-Міхайлаўскі прыход г. Мінска, вул. Янкоўскага, 2

## Святая Чатырохдзесятніца – Вялікі пост

Вялікі пост, які працінаецца на працягу сарака дзён перад Лазаравай суботай, з'яўляецца самым старажытным з усіх шматдзённых пастоў, якія адзначаныя ў календары Праваслаўнай Царквы.

Першапачатковае яго прызначэнне было звязана з катэхізацыяй будучых хрысціянаў, якія мелі прыняць хрышчэнне на Пасху. У тыя часы хрысцілі дарослых людзей пасля спецыяльнай падрыхтоўкі, якая па-грэцку называлася *катэхізіс*, то бок "*вуснае настаўленне*", "*аглашэнне*". Рыхтуючыся да самага важнага ў сваім жыцці кроку, катэхумены не толькі вывучалі асновы веры, але і ўзмоцнена маліліся ды трымалі саракадзённы пост на ўспамін таго посту, які трымаў перад выхадам на Сваё пастырскае служэнне Сам Гасподзь наш Ісус Хрыстос. Разам з новымі супольнікамі малілася ды пасціла і ўся царква верных, падтрымліваючы катэхуменаў саборнай малітвай.

Падчас Святой Чатырохдзесятніцы ў храмах прачытваюцца кнігі Бібліі, якія лічыліся найбольш важнымі для

асветы будучых хрысціянаў – Быццё, Псалтыр, Прыпавесці Саламона, Прароцтва Ісаі ды, канешне ж, Евангеллі.

З цягам часу практыка Вялікага посту зазнала моцны ўплыў звычаяў манаства, якое зарадзілася як духоўны рух у IV ст. і вядзе свой радавод ад святых вялікіх айцоў Антонія, Пахома і Васіля. Менавіта манаства сфармавала багаслужбовы парадак Святой Чатырохдзесятніцы – адмысловы чын вячэрняў, павячэр'яў, палуначніц і гадзін, а таксама прычасце раней асвечанымі Дарамі двойчы на тыдзень. Боская літургія пры гэтым служыцца толькі ў суботу і нядзелю, прычым нядзельная літургія трымаецца больш старога чыну Васіля Вялікага.

Такі парадак багаслужбаў быў звязаны з тым, што раннія айцы-пустыннікі праводзілі Вялікі пост, жывучы паасобку ў пустыні і збіраліся для агульных службаў толькі ў суботу і нядзелю. Таму будзённымі днямі служыліся толькі службы, якія могуць быць прачытаныя келейна: вячэрня, павячэр'е і інш.

Першапачаткова келейным было і прычасце раней асвечанымі Дарамі, якія айцы-пустыннікі, відавочна, бралі з сабой з нядзельнай службы. Аднак пазней, хутчэй за ўсё, пры пранікненні манаскіх звычаяў у багаслужбовы парадак гарадскіх храмаў, сфармавалася спецыяльная служба – літургія раней асвечаных Дароў, аўтарства якой прыпісваецца папу рымскаму свяцісцелю Грыгору Дыялагісту. Гэты чын уяўляе сабой вячэрню, якая мусіць служыцца ўвечары серады і пятніцы, вянчаючы сабой дні самага строгага посту. Аднак, у некаторых храмах гэтую службу служаць раніцай серады і пятніцы, тлумачачы гэта недастатковай строгасцю посту міран, што супярэчыць традыцыі.

У першы тыдзень посту чытаецца пакаянны канон богаўпадабанага Андрэя Крыцкага. Гэты твор духоўнай гімнаграфіі вельмі доўгі, таму прачытваецца не запар, а чатырма амаль роўнымі часткамі на павячэр'ях панядзелка, аўторка, серады і чацвярга першага тыдню. У пятніцу адбываецца асвячэнне коліва – адмысловага віду поснай ежы.

Адносна ежы у Вялікі пост у Рускай праваслаўнай царкве існуе толькі манаскі статут. Згодна з ім першы панядзелак посту неабходна ўстрымацца ад ежы, а ў астатнія панядзелкі, серады і пятніцы належыць "сухаядзенне", то бок адмаўленне ад гарачай ежы. У аўторак і чацвер дазваляецца прыгатаваная ежа без алею, а ў суботу і нядзелю – з алеем і віном. Калі свята Дабравешчання прыпадае на Святую Чатырохдзесятніцу, то ў гэты дзень дазваляецца рыба.

Аднак на практыцы не многія міране вытрымліваюць такую строгасць посту, таму кожны прытрымліваецца тога ўзроўню ўстрымання, да якой дарос духоўна і якую дазваляе ягоны фізічны стан. Зрэшты, з улікам абставін, посны стол мяняўся і ў манастырах. Так, у Салавецкім манастыры здавён на працягу ўсяго Вялікага посту